На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

№ 112 (464)

Субота, 20 чэрвеня 1998 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 3000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	4.18	21.43
Магілёў	4.26	21.34
Гомель	4.32	21.23
Мінск	4.36	21.45
Гродна	4.53	21.59
Брэст	5.03	21.51

Маладзік 24 чэрвеня.

Ну что тут скажешь?

"Партизан на допросе" Николай Бузо

Заместитель министра иностранных дел на брифинге 18 июня отказался предоставить прессе документ об урегулировании ситуации в Дроздах.

Чиновник внешнеполитического ведомства отказался отвечать на вопросы о содержании документа, снимающего остроту международного инцидента.

Белорусский дипломат отказался комментировать факты, которые журналисты разузнали через иностранные посольства и иными окольными путями.

Гражданин Н.П.Бузо попрал нормы статьи 32 "Право на получение информации" Закона Республики Беларусь "О печати и других средствах массовой информации".

Кіраўнік дэлегацыі дэпутатаў бундэстага ФРГ заклікала Аляксандра Лукашэнку аднавіць свабоду СМІ ў Беларусі

Дэпутаты бундэстага ФРГ запатрабавалі вызвалення арыштаваных беларускімі ўладамі членаў Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Андрэя Клімава і Уладзіміра Кудзінава. Аб гэтым гаворыцца ў прэс-рэлізе, распаўсюджаным Пасольствам Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь.

Адпаведная заява была зроблена дэпутатам ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі спадарыняй Утай Цапф, якая ўзначальвае дэлегацыю парламенцкай групы "Беларусь" у бундэстагу. Дэлегацыя была ў Мінску з 10 па 12 чэрвеня і мела сустрэчы з членамі Вярхоўнага Савета 13-га склікання, прадстаўнікамі Хартыі-97, кіраўніцтвам Беларускага Хельсінкскага камітэта.

"Мы з заклапочанасцю назіраем за развіццём падзей у Рэспубліцы Беларусь, — заявіла Ута Цапф пасля гэтых сустрэч. — Існуе вельмі вялікая колькасць ініцыятыў і груп, члены якіх выступаюць за дэмакратызацыю краіны, у той час як урад у вялікай ступені ўшчамляе дэмакратычныя правы". Ад імя дэлегацыі яна заклікала прэзідэнта А.Лукашэнку аднавіць свабоду сродкаў масавай інфармацыі ў рэспубліцы.

На думку дэпутатаў бундэстага, будучыня Беларусі залежыць ад правядзення свабодных выбараў. Пры гэтым прысутнасць на іх міжнародных назіральнікаў будзе неабходнай умовай, падкрэсліла спадарыня Цапф. Германскія парламентарыі заклікалі беларускі ўрад і апазіцыю знайсці кампраміс у пытанні правядзення свабодных выбараў, выкарыстоўваючы дапамогу місіі АБСЕ.

Сяргей ЛІТВІН, БелаПАН.

Мінскія ўлады санкцыянавалі правядзенне 25 чэрвеня шэсця і мітынгу, арганізатарам якіх выступае БКДП

Мінскі гарвыканкам дазволіў Беларускаму кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) правядзенне 25 чэрвеня шэсця і мітынгу пад лозунгам "Супраць зніжэння жыццёвага ўзроўню і росту цэн". Шэсце пачнецца ў 17.30 з плошчы Якуба Коласа. Аналагічныя акцыі пратэсту пройдуць у гэты дзень у многіх гарадах рэспублікі; іх арганізатарамі выступаюць незалежныя прафсаюзы.

Як раней паведамляў БелаПАН, прычынай незадаволенасці прафсаюзаў стала невыкананне ўрадам Генеральнага пагаднення на 1998—2000 гады па многіх параметрах, а таксама пастаяннае зніжэнне ўзроўню жыцця і рост цэн.

Наталля КУЛАГІНА.

Непрычасанае пісьмо

"И жалкий лепет оправданья..."

Аднойчы член Кастытуцыйнага суда спадар В.Фадзееў у даволі даўнім ужо артыкуле "Не судите, да не судимы будете" апраўдвае Канстытуцыйны суд што ён не абараніў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года. Довады прыводзіць смяхотныя: " не получилось, не хватило опыта, не хватило еще чего-то..."

Так, магчыма не хапіла рашучасці, смеласці..., але э гэта не апраўданне!

У кінафільме "Афіцэры" чалавек гонару і годнасці — былы афіцэр царскай арміі выказаўся так: "Ёсць такая прафесія — абараняць Радзіму". Гэта трэба разумець так: у выпадку небясьпекі для Радзімы, чалавек, які выбраў прафесію — абараняць Радзіму, павінен праявіць рашучасць, смеласць і не шкадуючы крыві і нават самаго жыцця абараніць Радзіму.

Суадносна і члены Канстытуцыйнага суда павінны былі праявіць рашучасць, смеласць і не шкадуючы крыві і нават самаго жыцця абараніць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь!

Не абаранілі... і пры тым хочуць, каб іх не судзілі. Не, паважаныя! Судзіць Вас трэба і судзіць Вас будзе "грозный судия" (успомнім М.Лермантава: "і ён не будзе зважаць на Ваш "жалкий лепет оправданья...").

У апраўданне Вам можа быць залічана тое, што Вы і ўся "трудовая интеллигенция", да ліку якой мы адносімся, асвоілі тактыку "премудрого пескаря": кожны ў сваёй норцы і стараецца "не высовываться".

"На заре Советской власти" "вождь мирового пролетариата" сказаў аб інтэлігенцыі: "интеллигенция — г...".

Яму не адкажаш у прадбачлівасці: колькі гадоў прайшло, а інтэлігенцыя так і засталася г... Толькі новыя "вожди" называюць яе трохі па іншаму: "дерьмократы".

Каб пазбавіцца ад гэтай непрыемнай назвы, інтэлігенцыі неабходна вылезці з сваіх "норак" і стаць авангардам свайго народа, стаць яго абаронай, яго інтэлектуальнай сілай. Для гэтага кожны інтэліген павінен стаць чалавекам гонару і годнасці.

А пакуль мы — інтэлігенцыя ўсё яшчэ г.., у народа без цяжкасцей адбіраюць і свабоду і незалежнасць і нашу Канстытуцыю.

Яўген ЛІТВІН.

Стоп-кадр



Салістка фальклорнага калектыву "Суніччка" Марына Шпак з вёскі Стай Лепельскага раёна.
Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА.

Першы набор вучняў аб'явіла духоўнае вучылішча пры Віцебскім Епархіяльным Упраўленні Беларускага Экзархата

Свой першы набор аб'явіла духоўнае вучылішча пры Віцебскім Епархіяльным Упраўленні Беларускага Экзархата. Новая навучальная ўстанова будзе рыхтаваць царкоўнаслужыцеляў праваслаўнай царквы, у тым ліку катэхізатараў-выкладчыкаў нядзельных школ, рэгентаў царкоўных хораў, чытальнікаў, псаломшчыкаў.

Паступаючым у вучылішча трэба будзе прайсці выпрабаванні на веданне пачатковых, ранішніх, вячэрніх і іншых малітваў, уменне чытаць на царкоўнаславянскай мове, а таксама на наяўнасць музыкальнага слыху. Апрача таго, яны павінны прадставіць у канцылярыю вучылішча 11 розных дакументаў і даведак, сярод якіх — рэкамендацыя прыходскага святара, даведка аб хрышчэнні і іншыя.

Яўген ГАЙ, БелаПАН.

Напачатку ліпеня адбудуцца афіцыйныя візіты кіраўніка беларускага МЗС Івана Антановіча ў КНР і Таджыкістан

Як паведаміў на брыфінгу намеснік міністра замежных спраў Мікалай Бузо, плануецца, што з 30 чэрвеня па 3 ліпеня міністр замежных спраў Беларусі Іван Антановіч наведае з афіцыйным візітам Кітайскую Народную Рэспубліку.

На 6—8 ліпеня запланаваны афіцыйны візіт кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі ў Рэспубліку Таджыкістан.

Аляксей АРЭШКА, БелаПАН.

Нельзя молчать!

Мракобесы низвергают памятники

Уже много десятилетий не сносили в Европе кресты. Сегодня такой факт стал реальностью в Бобруйске. В этом городе в тайне от общественности в районе площади Победы был снесен недостроенный памятник жертвам политических репрессий, на вершине которого находился крест, освященный церковью, а также недостроенная часовня. На этом месте положен лишь кусок известняка с маловразумительной надписью. Все это происходило в соответствии с решениями горисполкома, которым руководит товарищ Романовский.

Итак, жертвы большевистских репрессий получили вместо памятника лишь "памятный знак". Белый цвет его, по мысли многих бобруйчан, символизирует "отмывание" палачей.

Это до предела циничное надругательство над памятью тех, кого перемолола страшная машина репрессий, чьи могилы остались неизвестными. Таких было тысячи и тысячи, но до сего времени они не удостоились хотя бы простейшего человеческого памятника, а попытка их близких создать памятник своим отцам и матерям была встречена в штыки воинствующими большевиками, ставшими у власти в городе волею главного большевика страны.

Как можно дойти до такой низости, чтобы наплевать в души людей, которые собирали пожертвования на памятник, хлопотали и с великим трудом отвоевали для памятника маленький клочок земли, надеясь устроить все по-человечески! Увы, их надеждам не суждено было сбыться: мракобесы по-прежнему ходят по нашей земле, решают все и правят с неуемной энергией. Они ведут тотальный контроль за всеми сторонами жизни людей, включая и духовную. Они и только они знают, как нужно чтить память, что можно писать на памятнике, а чего писать нельзя.

Духовные наследники Сталина боятся правды истории, их пугает даже надпись, напоминающая о тех злодеяниях, которые вершились на этой многострадальной земле. Упоминания о палачах для них недопустимы, ибо они не только не раскаялись в страшных грехах преступных организаций, в которых состояли и которым они дали лишь новые вывески, — они готовы повторить все эти ужасы, если бы такая возможность у них появилась.

Для них нет ничего святого, кроме начальственной кормушки, они не знают, что такое память за пределами, очерченными их убогой идеологией. Они и их начальники готовы торговать — и уже успешно торгуют — оптом и в розницу национальным суверенитетом, радуясь, что имеют в руках ходовой товар, обменивая на нефть и газ. Они совершенно не желают думать о том, что будет после них, что скажут о них потомки.

Но рано или поздно их время все же кончится. И суд истории все расставит по своим местам. Справедливость восторжествует! В это верят большинство бобруйчан, людей честных и благородных.

Анна БАКАЧ,
Вячеслав ОВСЕЙЧИК,
Владимир КУРТУКОВ,
жители г.Бобруйска.

Дыскусія

Не трэба блытаць пачварны бальшавізм з фашызмам

Прачытаўшы артыкул Ільі Копыла "Фашизм — это когда...", надрукаваны ў "Народнай волі", мяне ахапіў глыбокі роздум... Чаму людзі такія наіўныя, чаму даюць сябе акалпачыць? Чаму даюць магчымасць перакласці віну з хворай галавы на здаровую? Возьмем цытату з гэтага артыкула: "фашизм — это когда притесняется и запрещается родной язык, искажается и замалчивается собственная история своей страны в угоду другой стране".

Дарэчы, увесь артыкул пабудаваны так, што бярэцца ўсё тое пачварнае і жахлівае, што адбываецца ў краіне, і ўсё гэта ставіцца ў віну фашызму.

Давайце разбяромся, што такое фашызм.

Паняцце "фашызм" пайшло ад італьянскага слова "фашызмо", нямецкага "фашына", лацінскага "фашыс", што азначае пучок, звязка, аб'яднанне. Другімі словамі, фашысты — гэта група людзей, аб'яднаных адной ідэяй. А ідэя гэтая — узнясенне, усхваленне сваёй нацыі, свайго народа за кошт урону, страт другіх народаў.

Калі ж уціскаецца, прыгнятаецца, забараняецца родная мова, скажаецца і замоўчваецца гісторыя свайго народа, сваёй краіны ва ўгоду другой краіне, то гэта не фашызм. Калі назіраецца адкрыты генацыд **свайго** народа, калі стараюцца, каб **свой** народ знік з планеты Зямля як этнас, як нацыя, то гэта ўжо ніяк не фашызм. Гэта пачварны бальшавізм!

Фашызм прынёс многа пакут і гора народам свету, але ж гэта дзеля ўзнясення, усхвалення сваёй нацыі, свайго народа (успомнім: "Германія найвышэй за ўсё"). Бальшавізм жа прынёс не менш гора і пакут народам свету (дарэчы, як вядома, менавіта бальшавізм садзейнічаў таму, што вырадзіўся фашызм), але ж бальшавізм узнёсся на касцях **свайго** народа за кошт масавых рэпрэсій, за кошт фізічнага знішчэння лепшых сыноў і дачок **свайго** народа!

Не, не варта у тым пачварным і жахлівым, што адбываецца ў нас, абвінавачваць фашызм. Фашызм тут ні пры чым. Гэта ўсё — пачварны бальшавізм!

Артыкул Ільі Копыла варта было б назваць так: "Большевизм — это когда..." І ў тэксце паўсюдна варта было б памяняць "фашизм — это когда..." на "большевизм — это когда...".

Яўген ФІЛІПОВІЧ.
п.Гарадзішча.

"Гарачы" факт

Што далей? Зноў высякаць антонаўкі ды белы наліў?

На мінулым тыдні быў у вёсцы, размаўляў з прадстаўніком "вертыкалі" на вёсцы — старшынёй выканкама сельскага савета, што ва Уздзенскім раёне. На пытанне аб навінах, зменах, ён толькі развёў рукамі і паскардзіўся, што трэба гаварыць аб вяртанні сталінскіх, хрушчоўскіх часоў: у выканкамы саветаў даслалі загад ад больш высокай "вертыкалі" выдаць даныя па кожнай сядзібе, кожнай прыватнай гаспадарцы аб наяўнасці і дакладнай колькасьці яблынь, ігруш, сліў, вішні, кустоў агрэста, парэчак, плошчы, якія засеяны суніцамі, трускаўкамі і гэтак далей. І вось ён вымушаны адправіць па вёсках сваіх супрацоўнікаў-"інспектараў" для выканання гэтага загаду.

Што ж будзе далей? Падаткі на садовыя дрэвы? Пачнём высякаць антонаўкі і белы наліў? Даных па наяўнасці і колькасці курэй, кароў, авечак пакуль, сказаў, не патрабавалі. Даных па колькасці комінаў над страхой таксама не патрабуюць. Ці ж гэта надоўга? Трымайся, вясковец, пенсіянер на лецішчы, ідзе стабілізацыя, інтэграцыя, калектывізацыя...

Мікалай КЛІМОВІЧ.
Мінск.

...І каментарый

Яблыні лічаць не дзеля падаткаў, а для статыстыкі. Пакуль што...

Ліст, які даслаў у рэдакцыю "Народнай волі" Мікалай Пятровіч Клімовіч, не першы на гэту далікатную тэму. Людзей хвалюе: чаму гэта праз паўзу ў дзесяцігоддзі пасля хрушчоўскай "адлігі" зноў пачалі лічыць садовыя дрэўцы, ягаднікі? Ці ж не дзеля падаткаў? Аднак тэлефанаванні ў Дзяржаўны падаткова камітэт плёну не далі. Як запэўнівалі кожны раз мяне суразмоўцы з паўнамоцтвамі даваць інфармацыю, ніякага падобнага дакумента, якім кіраваліся б на месцах "вертыкальшчыкі", яны, падаткавікі, не стваралі і нікуды не адпраўлялі. І ў гэтым была праўда.

Аднак рэдакцыя нашай газеты, друкуючы такія звесткі і, зразумела, давяраючы падаткавікам, усё ж выказала сумненне: маўляў, малаверагодна, каб мясцовыя ўлады пачыналі збіраць звесткі аб яблынях ды ягадніках, іншых насаджэннях па сваёй уласнай ініцыятыве.

І тое, што ў рэдакцыі сумняваліся не без падстаў, пацвердзіў адзін тэлефонны званок. Тэлефанавала жанчына па прозвішчы Інкогніта (не пажадала прадставіцца). Затое абвінавачваць газету пачала ад усёй сваёй "шчодрай" душы. Маўляў, так і так, навошта распальваеце страсці, уздымаеце ажыятаж і... нават зводзіце насельніцтва ў зман. А ці вядома вам, што пералічваюць яблыні, грушы, слівы, ягаднікі дзеля статыстыкі?

Не прадстаўляла цяжкасці "вылічыць", што субяседніца — статыстык. І я патэлефанаваў у Міністэрства статыстыкі і аналізу. Кіраўнік ўпраўлення статыстыкі сельскай гаспадаркі Валянціна Мікалаеўна Сінкевіч удакладніла, што арганізацыйныя рэкамендацыі, як і розныя бланкі, яе падначаленыя разаслалі ва ўсе раёны рэспублікі. А пра тое, хто званіў, яна ў курсе і не супраць працягнуць тэлефонную размову. А "старая знаёмая" аказалася пенсіянеркай, якую запрасілі часова папрацаваць у час водпускаў. Застаецца толькі падзякаваць статыстыку-пенсіянерцы, якая не страціла баявы пыл і задор і дапамагла ўстанавіць ісціну... (Прозвішча ж яе не "рассакрэчваем" па іншых абставінах.)

Размова ж са статыстыкам навяла на роздум. А ці ж не варта было перш чым накіроўваць у вёскі "рэгістратараў", паведаміць праз радыё, тэлебачанне, прэсу аб сапраўдных мэтах акцыі, што праводзіцца. І такім чынам пазбегнуць плётак аб падатках. Аднак у нашых міністэрствах не асабліва рупяцца ды спяшаюцца, каб загадзя даць насельніцтву інфармацыю, якую чакаюць.

А мажліва, палохаюцца спасылацца на дзяржустанову. Бо лічбы статыстыкі збяруць унушальныя, а ўлады ў адно імгненне заявяць, што настаў час паклапаціцца і аб падатках, бо вельмі ўжо ўтульна ўладкаваліся гэтыя агароднікі ды садаводы.

Пажывём — убачым...

Віктар СВІРКО.

Дорогой друг "Народной воли"!

Используй свой последний шанс — сегодня еще можно подписаться на "Народную волю".

Как ни тяжело достается хлеб насущный, но остаться без пищи духовной — еще тяжелее.

Стоимость подписки: на месяц — 45.000 рублей, на квартал — 135.000 рублей, на полугодие — 270.000 рублей.

Вы — с "Народной волей", "Народная воля" — с Вами!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **6 3 2 2 2** (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **6 3 2 2 2** (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

Народная Воля

Кошт	падпіскі	руб.	Колькасць камплектаў
	перaадрасоўкі	руб.	

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12


Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Надвор'е

20 і 21 чэрвеня на тэрыторыі рэспублікі воблачна з праясненнямі, 20-га на большай частцы тэрыторыі, 21-га — па паўднёвым усходзе рэспублікі дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 20-га — +9...+14, 21-га — +7...+12; удзень — +16...+21.

Демократия по-белорусски



Алло, "майор", алло! Ты меня не бойся! Никого не укушу, ты не беспокойся...

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель "Народной воли".

Представители "Народной воли" не присутствовали на брифинге премьера России Сергея Кириенко, который состоялся 10 июня 1998 года в правительственной резиденции в Войсковом переулке Минска. Почему? Простейший и в то же время таинственнейший вопрос.

О простейшем дал пояснения редакции по телефону пресс-секретарь председателя Совета министров Дмитрий Малиновский. Он пояснил, что на такого рода брифинги не надо оформлять разовую или какую-либо иную аккредитацию, достаточно позвонить в пресс-службу правительства или ему, Дмитрию Иосифовичу.

За два дня до события наша редакция "заявилась" на мероприятие даже более обстоятельно, чем требуют положения и инструкции, предоставив заверенную редактором бумагу о желании послать своего представителя, в частности, политического обозревателя, на брифинг главы российского правительства. Вашу покорную слугу, по информации пресс-секретаря, занесли в списки. Было сказано, что в означенный день и час Л.Маслюкова может следовать в Войсковой переулок.

В означенный день загодя я позвонила пресс-секретарю Сергея Линга и узнала, что в допуске в правительственную резиденцию мне отказано. Для Дмитрия Малиновского момент был суматошный и поэтому с "простейшим и таинственнейшим" вопросом — кто меня вычеркнул из списка? — обратилась к нему позже.

Коллега любезно пояснил, что количество приглашений для журналистов на такие мероприятия определяется не некой избирательностью организаторов, а тем простым обстоятельством, что, к примеру, посадочных мест на брифинге всего, скажем, 36, а заявок от прессы на представительство там гораздо больше — все желающие не вмещаются.

Так, на мой взгляд, мы выяснили первейший прием, с помощью которого власть отстраняет от источников информации журналистов, имеющих право и желающих получить ее. Выбери для брифинга тесное помещение — и предварительная цензура вступает в действие, причем завуалированно, неподсудно и ненаказуемо. К кому же в таком случае апеллировать — к "посадочному месту"? При этом заранее ясно как божий день, что к визиту Сергея Кириенко в Беларусь, тем более первому, пресса, естественно, проявит повышенный интерес, и на такой брифинг устремятся многие репортеры, обозреватели, телеоператоры и фотокоры. Разве так сложно предусмотреть выделение достаточно просторного зала для неограниченного общения премьера России с прессой?

Если представительство СМИ на брифингах высоких должностных лиц базируется на "посадочном месте", то, конечно, те же "Навіны" или та же "Народная воля" всегда останутся без оного. Хотя, что касается меня, то я и не собираюсь там сидеть — могу стоять, приткнуться, втиснуться. Главное для журналиста — присутствовать, видеть и слышать. И меня, по логике, не должны касаться проблемы организаторов таких брифингов: это они получают деньги за надлежащее проведение "мероприятий", у них пусть и голова болит.

Впрочем, мои попытки поставить элементарные организационные вопросы перед пресс-секретарем белорусского премьера успеха не имели. Дмитрий Малиновский парировал их классическим, универсальным, неотразимым аргументом: "Не в моей компетенции..." И тут он стопроцентно прав. Если бы я подала на него иск в суд за недопущение на брифинг и нарушение положений закона о печати, то Фемида подтвердила бы его правоту: таки-да, не в его компетенции. "Тогда в чьей? — домогалась я с вынужденной и раздражающей собеседника настойчивостью. — Скажите, пожалуйста, просто и прямо, кто вычеркнул меня из списка приглашенных на брифинг Кириенко?" Тогда Дмитрий Иосифович напомнил, что брифинги и пресс-конференции первых лиц государств — мероприятия специальные, режимные и требуют принятия повышенных мер безопасности высоких персон.

В ходе уже несколько напряженного диалога выяснилось, что пресс-секретарь премьера посылал по факсу список приглашенных на брифинг Кириенко в "специальные органы"... На просьбу назвать мне номер факса, чтобы я могла пообщаться с таинственным цербером в погонах, Дмитрий Иосифович ответил сакраментальным: "Я не знаю!" Я, со своей стороны, не думаю, что пресс-секретарь как бы в прострации посылает факсы по неизвестному номеру и незнамо кому... Его ответ "Я не знаю" восприняла как иносказание и на свой страх и риск интерпретировала его так: "Я не смею сказать..." Такое допущение имею я право сделать, столкнувшись с такой таинственностью в простейшем вопросе о том, как же в интересах читателей моей газеты попасть мне в эпицентр важного для республики события? Могу я предположить, что сидит где-то там, в недрах службы безопасности, тот самый "мой" майор, который и перечеркнул мою фамилию в списке-заявке? Он, может, и не майор, а в другом звании, и должность мне его неведома, но ведь главное в том, что он-то меня вычеркнул, а я-то его ну никак достать не могу.

Давайте, что ли, хором все читатели и подписчики "Народной воли" громко крикнем — алло, "майор", алло! Вдруг услышит? Пожалуй, и услышит, или доведут ему до ушей, но, думаю, не отзовется, тоже не посмеет, а то его с работы того...

Публично со страниц "Народной воли" я хотела бы задать сотруднику службы безопасности риторический вопрос: "Голубчик вы мой таинственный, почему же вы свою работу, за которую вам платит народ деньги, выполняете из рук вон плохо, в результате чего страдаю я, невинная?" Обеспечить безопасность премьеру России — это дело охранников. Вместо того чтобы делать свое дело профессионально, они попросту "отсекают" таких, как я, журналистов. Халтура это, ребята, откровенная халтура! Или, может, косвенная цензура?..

Лично от меня защитить господина Кириенко совсем нетрудно: ростом и габаритами я еще меньше, чем он. Не представляет никакого труда проверить и ощупать, что имею при себе блокнот и ручку да диктофон, а не ружье, мину или бомбу. Имею действительное редакционное удостоверение и удостоверение Белорусского союза журналистов. Если вам это так необходимо, ладно уж, так и быть, могу предоставить даже справку о том, что на учете в психдиспансере не значусь. Могу привести десятки свидетелей, которые дадут показания под присягой, что за 23 года работы в белорусской журналистике ни разу нигде и никогда не впадала в состояние аффекта, не кидалась на людей и характер имею почти нордический.

Я бы многое сказала "майору", если бы нашла его, заветного и глубоко законспирированного. Пожалуй, и русскую народную ему бы напела: "Ой, ой, ой-ся, ты меня не бойся, я тебя не укушу, ты не беспокойся!" Подозревая, что это скорее всего мужчина, я, может, как-нибудь внушила бы ему, что недостойно своего пола ведет он себя, как та девица, которая "увидала комара — в обморок упала".

Но, увы, окончательный состав списка приглашенных журналистов определяет Некто... Как я могу опротестовать его действия в суде? Как я могу создать судебный прецедент о нарушении моих прав журналиста? Никак... Потому что для них я Никто, а не законный представитель четвертой власти.

В сущности, ответ на все поставленные по случаю вопросы сама я знаю и без них: не пускали, не пускаем и не пустим.

И недостижим тот, кто это решает...

Мы с читателями до их уровня опускаться не можем и потому, анализируя ситуацию, оперируем аргументами разума.

В юридической консультации Михаила Пастухова

Можно ли изменить свою национальность?

Предки мои являются польскими дворянами (польской шляхтой). При Сталине дед просидел 10 лет. Потом сжег документы, подтверждающие, что он является лицом польской национальности, и приобрел за энную сумму документ о том, что он белорус. Мой отец не хочет признавать себя поляком и у нас с ним идет долгий спор.

Мне 22 года, и пришло время поменять старый паспорт на новый. Но в старом паспорте стоит национальность "белорус", а я хочу, чтобы было "поляк".

Могу ли я при получении нового паспорта написать в графе "национальность" — поляк?

А.Свиршевский.
г.Новополоцк.

Скорее всего поменять национальность Вам не разрешат. Дело в том, что национальность гражданина Республики Беларусь определяется национальностью родителей на основании свидетельства о его рождении. Согласно Инструкции о порядке определения национальной принадлежности граждан Республики Беларусь, утвержденной приказом министра юстиции 9 июня 1997 года, при обмене паспорта гражданина СССР образца 1974 года запись о национальности вносится на основании сведений записи о национальной принадлежности, указанных в предъявленном для обмена паспорте, а гражданам, которые получили паспорт гражданина Республики Беларусь образца 1996 года на момент вступления в силу настоящей Инструкции, национальность указывается на основании свидетельства о его рождении по национальности одного из родителей. Гражданам, которым была внесена отметка о национальной принадлежности в паспорт гражданина Республики Беларусь до достижения 18-летнего возраста, национальность может быть изменена соответственно национальности другого родителя.

Запись о национальности в актах гражданского состояния производится органами загса на основании паспорта гражданина, его свидетельства о рождении и других документов, подтверждающих его национальную принадлежность. Изменение записи о национальности в акты гражданского состояния вносится по заключению органа загс.

Неужели указы выше законов?

В прошлом году я обращалась в судебные инстанции, чтобы суд помог мне защитить закон. Но отовсюду получен отрицательный ответ (высылаю копии ответов судебных инстанций).

Хотелось бы узнать, чем ответ бухгалтера И.Н.Попковой отличается от ответа судьи П.Ф.Герасимчик?

Л.Н.Сычева,
п. Ждановичи Минского района.

Суть дела такова. Л.Н.Сычева работала медицинской сестрой в санатории "Крыніца". Она пользовалась льготами по оплате жилья и коммунальных услуг до января 1996 года, после чего администрация санатория отказалась предоставить ей льготы, ссылаясь на указ президента Республики Беларусь от 1 сентября 1995 года №349 "Об упорядочении льгот для отдельных категорий граждан".

Она с этим не согласилась и потребовала восстановить свои нарушенные права. В ответ получила письмо, подписанное главным бухгалтером И.Н.Попковой: "На ваше заявление сообщаем, что Конституционный суд не вправе отменить указ президента Республики Беларусь №349 от 1.09.96 г. "О льготах медикам" (здесь допущена ошибка в названии указа. — **М.П.**). Изменения и дополнения может подписать только президент Республики Беларусь, тогда они имеют законную силу".

Такая отписка не устроила Л.Н.Сычеву, и она обратилась в суд с иском к санаторию "Крыніца" о взыскании 1.100.000 рублей, незаконно удержанных при взыскании квартплаты в период с января 1996 года по март 1997 года.

Суд в иске Л.Н.Сычевой отказал, ссылаясь на отмену льгот по указу президента, от которого она просила ее защитить. Минский областной суд оставил решение районного суда в силе. В ответе и.о. председателя Минского областного суда П.Ф.Герасимчик буквально записано следующее: "На основании заключения Конституционного суда Республики Беларусь от 26 декабря 1995 года вышеназванный указ признан не имеющим юридической силы от 1 сентября 1995 года, однако в связи с тем, что нормативные акты, принятые на основе и во исполнение указа от 1 сентября 1995 года №349, так и не были приведены в соответствие с заключением Конституционного суда Республики Беларусь, указ продолжает действовать и приостанавливает действие в том числе и ст.61 Закона Республики Беларусь "О здравоохранении".

Верховный суд в своем отказе был немногословен: "Состоявшиеся по делу постановления являются законными и обоснованными и оснований к их отмене не имеется".

Как видим, круг замкнулся. Вся судебная система — от районного суда до Верховного — приняла "на вооружение" антиправовой тезис: указ президента, даже отмененный в установленном порядке Конституционным судом, продолжает действовать и, более того, отменяет действие законов. Это означает, что правовая пирамида повернулась с ног на голову — теперь акты исполнительной власти имеют приоритет перед Конституцией и законами. А суды, похоже, предали забвению главные заповеди правосудия — судить справедливо, судить по закону.

Получается, что ответ бухгалтера мало чем отличается от решений судей — все они исходят из верховенства указа над законом. Однако такой подход не соответствует устоявшимся принципам демократического правового государства: верховенству закона, разделению властей, соблюдению прав человека. В этой связи согласен с Вами, что "перед законом, как перед Богом, все равны — и дворник, и журналист, и президент". И мне тоже не хочется думать, что живу в зоне строгого режима.

Вы правы в своих требованиях, и закон — на Вашей стороне. Другое дело, что нынешние судьи уклоняются от выполнения своих прямых обязанностей — защищать права людей, невзирая ни на какие препятствия и влияния.

Стоп-кадр

Медсестра неврологического отделения Витебской детской поликлиники Наталья Добрыня признана лучшей по профессии на проходившем здесь конкурсе профессионального мастерства.

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Дыпкур'ер

Былы пасол ЗША ў Беларусі назначаны кіраўніком амерыканскай дыпламатычнай місіі ў Грузіі

Былы пасол ЗША ў Беларусі Кенэт Яловіц у хуткім часе пачне выконваць абавязкі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Злучаных Штатаў Амерыкі ў Грузіі. Аб гэтым стала вядома 16 чэрвеня пасля слуханняў у камісіі па міжнародных адносінах сената ЗША, якая зацвердзіла кандыдатуру Яловіца на пасаду кіраўніка амерыканскай дыпламатычнай місіі ў Тбілісі.

Наглядальнікі адзначаюць, што адной з галоўных прычын, кіруючыся якімі прэзідэнт ЗША Біл Клінтан назначыў паслом у Грузію менавіта Кенэта Яловіца, з'яўляецца імкненне прымяніць багаты вопыт, набыты дыпламатам за некалькі гадоў работы ў Мінску, пры вырашэнні ўнутрыпалітычных канфліктаў у Грузіі.

Вадзім МІЛІЦЫН.

Спорт

У ветэранаў футбола будзе свой чэмпіянат

Сёлета ўпершыню будзе праведзены чэмпіянат Беларусі сярод ветэранаў футбола.

Як расказаў адзін з ініцыятараў правядзення чэмпіянату прэзідэнт Міжнароднага фонду ветэранаў беларускага футбола Леанід Федаровіч, ідэю правесці паўнацэнны турнір падтрымалі многія зоркі мінулых гадоў. У прыватнасці, вядомы ў мінулым абаронца Эдуард Зарэмба лічыць, што даўно трэба было сур'ёзна ўзяцца за арганізацыю такога турніру. На аднадушную думку ветэранаў футбола, чэмпіянат паслужыць добрай прапагандай спорту і здаровага спосабу жыцця. Балельшчыкі са стажам успомняць куміраў мінулага, а юныя аматары футбола змогуць убачыць на полі ігракоў, аб якіх толькі чулі і чыталі. Дарэчы, правядзенне чэмпіянату — чарговая акцыя фонду ветэранаў беларускага футбола. Яго кіраўнікі пастаянна падтрымліваюць сваіх падапечных, праводзяць ушаноўванні юбіляраў, дапамагаюць сем'ям былых футбалістаў.

Арганізатары чэмпіянату плануюць правесці сход прадстаўнікоў каманд-удзельніц будучага першынства, на якім разам будзе выпрацавана сістэма правядзення турніру, вырашаны іншыя арганізацыйныя пытанні. Тыя, хто жадае прыняць удзел у пасяджэнні аргкамітэта, могуць да пачатку ліпеня звязацца з ветэранскім фондам.

Ігар ХАДАСЕВІЧ, БелТА.

Здарэнне

Вінавата не толькі морква

У інфекцыйнае аддзяленне Івацэвіцкай бальніцы з дзіцячага сада "Алеся" паступілі адразу 22 дзіцяці з вострым атручэннем іерсініёзам — цяжкім кішэчным захворваннем. Яшчэ шасцёра дзяцей лечацца дома. Паводле заключэння ўрачоў, прычына інфекцыі — няякасна прыгатаваная ежа, у прыватнасці, салата з леташняй морквы, якая абавязкова павінна была прайсці тэрмічную апрацоўку.

Дарэчы, не так даўно падобнае здарылася і ў адной са школ райцэнтра, аб чым мясцовая санітарная служба паведаміла ўсім кропкам грамадскага харчавання і накіравала ім свае перасцярогі. Таму вінавата не толькі морква, але і дзетсадаўскія повары, якія нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў.

Гэты факт дэталёва расследавала спецыяльная камісія. Як стала вядома, шэф-повар і повар дашкольнай установы звольнены з работы. Загадчыцы дзетсада і старшай медсястры аб'яўлена строгая вымова. А здароўе дзяцей, якія трапілі ў бальніцу, на шчасце, цяпер не выклікае апасенняў.

Іван КУКСА, БелТА.

Адкрыты ліст

Можа, міністр памыляецца?

Прачытаў у "Звяздзе" за 14 красавіка 1998 года гутарку Алеся Карлюкевіча з міністрам адукацыі Васілём Стражавым і здзівіўся. Міністр заяўляе, што Закон аб мовах, які быў прыняты ў студзені 1990 года, парушаў канстытуцыйныя правы грамадзян рэспублікі і значна ўскладняў навучальна-выхаваўчы працэс ва ўстановах адукацыі. Ну і ну!

Далей В.І.Стражаў прыводзіць "статыстыку" аб стане беларускамоўнага навучання ў 1990—1991 навучальным годзе. З яе вынікае, што прымаць меры для выратавання беларускай мовы ніякай неабходнасці не было. Паводле інфармацыі міністра, на беларускай мове тады займаліся 79,2 працэнта вучняў, на рускай — толькі 20,8 працэнта. Ці шаноўнага міністра падвялі памочнікі, ці ён спецыяльна памяняў месцамі гэтыя працэнты. А стан беларускамоўнага навучання ў той час, як і цяпер, быў крытычны і ганебны для беларускай нацыі.

Дакладчык па моўным пытанні на сесіі Вярхоўнага Савета БССР у 1990 годзе Н.М.Мазай адзначала, што ў школах з рускай мовай навучання вучыліся 73,1 працэнта дзяцей Беларусі. Вядома, гэтая лічба была ўзятая з афіцыйнай статыстыкі, а ў сапраўднасці школ з рускай мовай выкладання большасці прадметаў было яшчэ болей. У Віцебскай вобласці ў школах з беларускай мовай навучання знаходзілася толькі 18 працэнтаў вучняў.

Звяртаючыся да сённяшняй моўнай практыкі ў сістэме адукацыі, В.І.Стражаў паведамляе, што ў бягучым навучальным годзе 61,5 працэнта школ працуюць на беларускай мове. Можа, гэта і так (у Віцебскай вобласці — толькі 23 працэнты школ з беларускай мовай навучання). Але ж трэба мець на ўвазе, што 40 працэнтаў усіх школ нашай краіны — гэта пачатковыя і базавыя школы. Яны, як правіла, малакамплектныя і амаль усе працуюць пакуль што на беларускай мове. Статыстыка міністра хавае трагічны стан спраў з беларускамоўным навучаннем у сярэдніх школах, дзе знаходзіцца большасць школьнікаў і куды пераходзяць вучні пасля пачатковай і базавай школы. Колькі ж сярэдніх школ з беларускай мовай навучання працуе ў Мінску, абласных цэнтрах, іншых гарадах Беларусі? Іх адзінкі. А колькі прафтэхвучылішчаў, тэхнікумаў, вышэйшых навучальных устаноў працуюць у незалежнай Беларусі на беларускай мове, шаноўны міністр? Русіфікацыя вышэйшай школы і з'яўляецца галоўнай прычынай змяншэння колькасці вучняў у школах і класах з беларускай мовай навучання ў параўнанні з 1993—1994 навучальным годам.

І яшчэ адно пытанне. Няўжо Вы, Васіль Іванавіч, верыце ў тое, што ў нашай краіне беларуская і руская мовы маюць аднолькавы статус, што мы паспяхова ідзём да беларуска-рускага двухмоўя? Дазвольце прывесці Вам словы аднаго з Вашых папярэднікаў на пасадзе міністра М.І.Дзямчука на 14-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР у 1990 годзе пры абмеркаванні праекта Закона аб мовах: "Наданне рускай мове статуса дзяржаўнай практычна не мяняе становішча з беларускай мовай. Як больш магутная, руская мова, атрымаўшы роўны з нацыянальнай мовай статус, канчаткова пераважыць над беларускай мовай".

Шаноўны Васіль Іванавіч! Не бярыце на сябе ролю аднаго з пахавальнікаў беларускай мовы. Давайце разам з усімі тымі, каго хвалюе лёс беларускай мовы, беларускай нацыі, падумаем над тым, што можна і трэба зрабіць у гэтай няпростай сітуацыі па выратаванні беларускай мовы. Думаю, што канкрэтным крокам Міністэрства адукацыі ў гэтым напрамку было б стварэнне нацыянальнага універсітэта з беларускай мовай навучання. Газеты "Народная воля", "Звязда" ўжо не аднойчы абмяркоўвалі гэтую праблему на сваіх старонках.

Іосіф НАВУМЧЫК,
старшыня Віцебскай абласной рады Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны.

Беларускае тэлебачанне не баіцца СНІДу

Першы летні месяц распачаў новы віток адліку ВІЧ-інфіцыраваных у Беларусі.

Па атрыманай інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра прафілактыкі СНІДу, колькасць заражаных ВІЧ-інфекцыяй імкліва перасягнула двухтысячную рысу і склала 2035 чалавек.

Каменціраваць даны факт у Цэнтры адмовіліся, стрымана ахарактарызаваўшы сітуацыю як "вельмі нестабільную". Адзначылі, што больш за 80 працэнтаў ВІЧ-інфіцыраваных складае моладзь ва ўзросце 15—29 гадоў. Большасць заражаных — наркаманы. Міжнародная Праграма ААН-СНІД прафінансуе адкрыццё ў Мінску трох пунктаў па абмене шпрыцоў для наркаманаў. Першы плануецца адкрыць у цэнтры горада летам у раёне Камароўскага рынку.

Спецыялісты Цэнтра прафілактыкі СНІДу таксама паведамілі, што вельмі сур'ёзнае становішча са СНІДам склалася ў турмах. Аднак параілі звярнуцца "непасрэдна ў адпаведнае міністэрства". Дарэчы, для міністэрстваў зараз пачалася актыўная падрыхтоўка кадраў, якія будуць займацца прафілактыкай ВІЧ-інфекцыі. Адзінае, хто не баіцца СНІДу, — гэта Беларускае тэлебачанне. Кіраўніцтва БТ упарціцца і не жадае прадстаўляць бясплатны эфір для відэаролікаў Цэнтра прафілактыкі СНІДу. "Нашыя кліпы паказваюць толькі два разы на дзень і ў вельмі нязручны час, іх практычна ніхто не бачыць, — сказала загадчыца аддзела арганізацыі эпідзабеспячэння і прафілактычнай работы Наталля Фірсава. — А потым людзі пытаюцца ў нас: "Дзе ваша інфармацыя па тэлебачанні?"

Наталля ВАЛАКІДА.

Крымінал

З-за неабачлівасці грамадзян і ў міліцыі больш работы

Нейкая Таццяна Паўлаўна, прачытаўшы ў гомельскай "Пресс-Рекламе" аб'яву аб здачы кватэры, ужо праз некалькі гадзін ветліва раскланьвалася перад гаспадыняй. Пусціўшы ў ход абаянне, паскардзіўшыся на складанае жыццё ў Літве, яна так спадабалася гаспадыні, што тая нават не папрасіла якіх-небудзь дакументаў, а толькі ўзяла месячную плату і перадала ёй ключы, а сама паехала да дачкі ў Маскву.

Праз некалькі гадзін новаспечаная гаспадыня паказвала ўжо апартаменты кватарантцы. А паколькі сама быццам бы тэрмінова ад'язджала, запатрабавала грошы як мінімум месяцаў за шэсць. І зноў, не пацікавіўшыся ні ордэрам на кватэру, ні пашпартам, новая кватэранаймальніца замест валюты, якой не хапала, прапанавала залаты ланцужок коштам 500 долараў ЗША.

За ключамі аферыстка прапанавала зайсці пазней, а сама тым часам пачала выносіць каштоўныя рэчы, а потым знікла ў невядомым напрамку. Калі сапраўдная гаспадыня прыехала з Масквы, то ўбачыла, што ў кватэры жывуць зусім незнаёмыя людзі і няма найбольш каштоўных рэчаў.

А Таццяна Паўлаўна такім метадам "перапрадавала" ўжо трэцюю кватэру.

Віктар КОТАЎ, БелТА.

Сусед-студэнт аказаўся забойцам

